# РЭЦЭНЗІІ

## АРЫЕНЦІР ДЛЯ СПАСЦІЖЭННЯ ЛІНГВІСТЫКІ (В.І. Рагаўцоў. Агульнае мовазнаўства: практыкум: вучэб. дапам. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2007. – 226 с.)

Атрымала далейшае развіццё публікацыя цыкла вучэбных дапаможнікаў прафесара В.І. Рагаўцова па агульналінгвістычных дысцыплінах. Услед за кнігай "Агульнае мовазнаўства", якая выйшла ў 2006 г. і ўжо знайшла шырокае прымяненне ў студэнцкім асяроддзі філалагічных факультэтаў універсітэтаў, з'явіўся яе лагічны працяг – практыкум, прызначаны для правядзення семінарскіх заняткаў і самастойнай працы студэнтаў па названым прадмеце.

Новы дапаможнік задуманы і створаны як адзінае цэлае з папярэднім, тэарэтычным, падручнікам. Пра гэта сведчаць, у прыватнасці, поўнасцю аналагічныя ранейшаму выданню 17 тэарэтыка-лінгвістычных тэм (раздзелаў), распрацаваных аўтарам. Кожны з раздзелаў уключае пытанні і заданні для праверкі засваення ведаў, урыўкі з лінгвістычных прац, пытанні да іх, а таксама спіс вучэбнай літаратуры. Кароткая прадмова змяшчае некаторыя метадычныя парады аўтара да вывучэння курса і рэкамендацыі па выкарыстанні дапаможніка. Падкрэсліваецца, што большасць тэарэтычных праблем лінгвістыкі не мае адназначнай інтэрпрэтацыі ў навуковых даследаваннях, а часам супярэчліва трактуецца нават аднымі і тымі ж мовазнаўцамі. Праблемнасць і дыскусійнасць – натуральны стан для любой навукі, якая развіваецца, і студэнт павінен адэкватна ўспрымаць гэта, фарміруючы ўласны пункт погляду на тое ці іншае пытанне, шукаючы найбольш прымальны варыянт рашэння і выказваючы ўласныя меркаванні.

Курс агульнага мовазнаўства, з аднаго боку, завяршае і падагульняе моўную падрыхтоўку студэнта-філолага, а з другога – закліка்ны стымуляваць самастойную прафесійную працу спецыялістаў, вызначыць арыенціры для далейшай самаадукацыі. Таму асабліва каштоўнымі з'яўляюцца дапаможнікі, якія накіраваны на развіццё творчага мыслення студэнтаў, фарміраванне ўменняў і навыкаў крытычнага аналізу шматлікіх канцэпцый, поглядаў, тэорый у лінгвістычнай навуцы. Новая кніга В.І. Рагаўцова ў поўнай ступені адпавядае згаданым патрабаванням. Яна пабудавана, па сутнасці, як своеасаблівая хрэстаматыя і змяшчае ўрыўкі з найбольш значных агульнамовазнаўчых прац вучоных розных краін. Акрамя таго, усе тэмы пачынаюцца з тэарэтычных пытанняў, неабходных для кантролю засваення адпаведнага матэрыялу з падручніка. Пытанні падаюцца і пасля кожнага ўрыўка з лінгвістычнай работы, што дае магчымасць праверыць узровень разумення студэнтамі няпростых навуковых тэкстаў, выявіць ступень здольнасці будучых філолагаў да самастойных разважанняў і высноў. Да такіх пошукавых, эўрыстычных пытанняў можна аднесці, напрыклад, наступныя: "У чым заключаецца значэнне мовазнаўства для іншых гуманітарных навук?" (с. 10), "Чаму лагічныя катэгорыі нельга атаясамліваць з граматычнымі?" (с. 19), "З чым звязваецца адрозненне дзвюх лінгвістык – лінгвістыкі мовы і лінгвістыкі маўлення?" (с. 40), "У чым своеасаблівасць *"трасянкі"?"* (с. 62) і многія іншыя. Адказы на іх, безумоўна, патрабуюць не толькі пошуку адпаведнага месца ў тэксце першакрыніцы, але і аргументаваных, падмацаваных фактамі ўласных меркаванняў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Змест і структура новага дапаможніка поўнасцю адпавядаюць адукацыйнаму стандарту і тыпавой праграме “Агульнае мовазнаўства” для педагагічных спецыяльнасцей. Дэталёвае знаёмства з тэкстам дазваляе сцвярджаць, што падрыхтаванае выданне з'яўляецца адказам на надзённыя запатрабаванні вышэйшай школы, актуальным і своечасовым дапаможнікам. Ён цалкам адпавядае агульнай філасофска-светапогляднай скіраванасці курса і метадычнай спецыфіцы яго выкладання ва універсітэце. Студэнты з поспехам могуць выкарыстаць такое выданне і ў самастойнай працы па-за межамі аўдыторыі.

У кнізе знайшлі адлюстраванне бадай што ўсе асноўныя праблемы сучаснай тэарэтычнай лінгвістыкі: мова і мысленне, знакавая прырода мовы, мова і маўленне, сістэма і структура мовы, мова і грамадства, мова як гістарычная з'ява, лінгвістычная тыпалогія, лінгвістычная універсалогія, метады даследавання мовы і інш. Увогуле дапаможнік пабудаваны лагічна і паслядоўна, да кожнай тэмы падабраны прадуманыя пытанні і яскравыя, характэрныя тэксты аўтарытэтных першакрыніц. Так, тэма “Фаналогія. Фанетыка і фанеміка” ілюструецца ўрыўкамі з класічных прац І. Бадуэна дэ Куртэнэ, Я. Паліванава, Л. Шчэрбы, М. Трубяцкога, тэма “Мова як гістарычная з'ява” прадстаўлена не менш значнымі работамі Г. Паўля, В. Гумбальта, Ф. дэ Сасюра, тэма “Лінгвістычная універсалогія” – знакамітымі творамі Р. Якабсона, Б. Успенскага і г.д.

Трэба заўважыць, што пэўная частка прыведзеных навуковых прац дубліруе (у перакладзе аўтара дапаможніка на беларускую мову) тэксты, змешчаныя ў вядомых хрэстаматыях па ўводзінах у мовазнаўства, агульным мовазнаўстве, гісторыі лінгвістыкі, складзеных У. Звегінцавым, Ф. Бярэзіным, Б. Касоўскім, М. Паўленкам, Б. Норманам і інш. Зрэшты, гэтая акалічнасць не змяншае навукова-тэарэтычнай вартасці класічных прац і хутчэй за ўсё выяўляе адносіны да іх (высокую ацэнку) з боку аўтара вучэбнага дапаможніка. Многія каштоўныя працы, галоўным чынам беларускіх лінгвістаў, уведзены ў шырокі студэнцкі ўжытак упершыню, што, бясспрэчна, будзе садзейнічаць больш поўнаму і ўсебаковаму ўяўленню пра сучасны стан распрацоўкі той ці іншай агульнамовазнаўчай праблемы, наглядна прадэманструе сённяшні тэарэтычны ўзровень айчыннай лінгвістыкі. Адзначым, у прыватнасці, вельмі паказальныя ўрыўкі з работ А. Падлужнага, Л. Шакуна, А. Міхневіча, Н. Мячкоўскай, І. Лепешава, А. Лукашанца, В. Русак. Разам з тым зусім не абавязковым бачыцца ўключэнне ў дапаможнік шэрагу фрагментаў з прац па русістыцы, апублікаваных пераважна ў 40 – 50-я гг. мінулага стагоддзя (С. Абакумава, Г. Шчура, Л. Мацвеевай-Ісаевай), тым больш што выкладзеныя ў іх погляды на канкрэтныя праблемы ў цэлым не адпавядаюць сучасным трактоўкам і ўяўляюць цікавасць хіба толькі з пункту погляду гісторыі мовазнаўчай навукі. З другога боку, у кнізе не атрымалі адлюстравання некаторыя актуальныя, глыбокія, наватарскія лінгвістычныя працы апошніх дзесяцігоддзяў, дзе выяўлены культуралагічныя і антрапацэнтрычныя падыходы да мовы, распрацаваны актуальныя праблемы лінгвасеміётыкі, псіхалінгвістыкі і тэорыі камунікацыі. Думаецца, гэтую заўвагу ў якасці пажадання можна выказаць аўтару на будучае.

Сказанае, безумоўна, ні ў якой ступені не зніжае агульнай высокай навуковай вартасці і лінгваметадычнай актуальнасці падрыхтаванага дапаможніка. Па нашым меркаванні, ён поўнасцю адпавядае сучаснаму стану развіцця айчыннай лінгвістычнай навукі і патрабаванням да вучэбнай літаратуры для студэнтаў універсітэтаў. Тэрміналагічны апарат, выкарыстаны аўтарам, з'яўляецца агульнапрынятым і замацаваным у навучальнай традыцыі. З выхадам кнігі В.І. Рагаўцова “Агульнае мовазнаўства: практыкум” студэнты і выкладчыкі ВНУ краіны атрымалі, па сутнасці, завершаны, арганічны вучэбна-метадычны комплекс па ад-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ным з найбольш складаных для засваення філалагічных курсаў. Хочацца выказаць упэўненасць, што новы дапаможнік, як і ранейшыя кнігі аўтара, выдатнага спецыяліста ў галіне мовы беларускай мастацкай літаратуры, паслужыць паўнацэннаму ўключэнню тэарэтыка-моваэнаўчых дысцыплін у нацыянальна-культурны кантэкст універсітэцкага навучання і стане надзейным арыенцірам для спасціжэння законаў і таямніц незвычайна цікавай, захапляльнай навукі – лінгвістыкі.

*Г.А. АРЦЯМЁНАК*